УДК 1(091)(476)«192»

Поступіў у рэдакцыю 02.02.2018
Received 02.02.2018

**І. М. Новік**

Інстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь

## ТЭМПАРАЛЬНАЯ СЕМАНТЫКА Ў ЭСЭ І. АБДЗІРАЛОВІЧА «АДВЕЧНЫМ ШЛЯХАМ»

*Артыкул прысвечаны тэмпаральнай семантыцы ў вядомым эсэ І. Абдзіраловіча (Канчэўскага) «Адвечным шляхам»: прааналізавана выкарыстанне ў тэксце адметных часавых форм і канструкцый дзеясловаў, паняццяў, слоў і фразеалагізмаў, звязаных з часам, гісторыяй і часавасцю чалавечага існавання, таксама як гэтыя лексічныя і сінтаксічныя сродкі дазваляюць аўтару эсэ развінаць сваю думку і будаваць пэўны вобраз Беларусі, яе культуры і месца ў сусветнай гісторыі. Адметнасці выкарыстання тэмпаральнай семантыкі, якія былі выяўлены намі ў артыкуле, далей інтэрпрэтуюцца ў межах канцэптуальна-метадалагічнай стратэгіі «аналізу выказванняў» М. Фуко, у якасці перфарматыўнага сцвярджэння, разгортвання адметнай часавасці. Часавасці, да якой аднолькава прыналежаць і аўтар, суб'ект выказвання ў «Адвечным шляху», і мы – чытачы дадзенага эсе, і гісторыя, і лёс Беларусі.*

***Ключавыя словы**: Ігнат Абдзіраловіч, Ігнат Канчэўскі, тэмпаральнасць, часавасць, беларуская філасофія*

**И. М. Новик**

Институт философии Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь

## ТЕМПОРАЛЬНАЯ СЕМАНТИКА В ЭССЕ И. АБДИРАЛОВИЧА «АДВЕЧНЫМ ШЛЯХАМ»

*Статья посвящена темпоральной семантике в известном эссе И. Абдираловича (Кончевского) «Адвечным шляхам» («Извечным путем»): анализируется использование в тексте специфических временных конструкций и форм глаголов, понятий, слов и фразеологизмов, связанных со временем, историей и временностью человеческого существования, а также то, как эти лексические и синтаксические средства позволяют Абдираловичу выражать свою мысль и строить определенный образ Беларуси, ее культуры и места в общемировой истории. Выявленные особенности использования темпоральной семантики трактуются в рамках концептуально-методологической стратегии «анализа высказываний» М. Фуко, как перформативное утверждение, развертывание специфической временности. Временности, к которой равно принадлежат и автор, субъект высказываний в эссе, и мы – читатели данного произведения, и история, и судьба Беларуси.*

***Ключевые слова:** Игнат Абдиралович, Игнат Кончевский, темпоральность, временность, белорусская философия*



pawet.net

**I. Novik**

Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

**TEMPORAL SEMANTICS IN THE ESSAY OF I. ABDZIRALOVIČ "ADVIEČNYM ŠLIACHAM" ("BY THE EVERLASTING WAY")**

*The article deals with temporal semantics in the famous essay of I. Abdziralovič (Kančeŭski) "Adviečnym šliacham" ("By the everlasting way"). Author analyses the use in text of specific tenses, as well as concepts, words and phraseological units associated with the time, history and temporality. The article studies how these lexical and syntactic means allow Abdziralovič to express his thought and build a certain image of Belarus, its culture and place in world history. The revealed features of the use of temporal semantics are interpreted within the framework of the conceptual strategy of "analysis of statements" by Michel Foucault. Accordingly, all Abdziralovič's temporal references are regarded as performative statements, or as unrevealing of specific temporality to which equally belong the author and subject of enonciations in "Adviečnym šliacham", we – readers of this essay, and history or fate of Belarus.*

***Key words**: Ignat Abdziralovič, Ignat Kančeŭski, temporality, Belarusian philosophy*

Шмат было сказана аб прасторы ў «Адвечным шляхам» І. Абдзіраловіча (Канчэўскага)[1]. Пра тыя катэгорыі «Захаду» і «Усходу», якія ў сваёй сутнасці і семантыцы ўсё меней утрымліваюць нешта ад уласна фізічнай прасторы і ўсё болей раствараюцца ў сваіх культуралагічных і палітычных канатацыях, але ў якія непазбыўна ўблытаны прасторавы досвед Беларусі, Украіны і балканскіх краёў [1, с. 8]. Шмат, але ж, магчыма, не досыць, не суразмерна таму маштабу, які займае гэтая невялікая брашура ў гісторыі беларускай думкі. Дзівіць жа тое, што шматлікія крытыкі, інтэрпрэтатары і адэпты тэксту не знайшлі нічога сказаць пра ролю, якую адыгрываюць час і тэмпаральнасць у канцэптуальных пабудовах гэтай кнігі[2]. Між тым роля гэтая не малая, прынамсі, не меншая, чым болей навочная для інтэрпрэтатараў роля супрацьпастаўлення Захаду і Усходу і азначэння месцазнаходжання Беларусі як адметнага «паміж». Падставай такога меркавання можа быць нават простае фармальнае разважанне: беларускую культуру магчыма асэнсаваць як памежны ці трансгранічны досвед, толькі ў межах тэмпаральных канструкцый «яшчэ не…», «усё яшчэ не…», «ужо ніколі болей не…»: адкладзенага ці адпрэчанага выбару на карысць адной з альтэрнатыў.

Яшчэ болей надзейнай зарукай таго, што такое прачытанне «Адвечным шляхам» праз катэгорыю тэмпаральнасці нязмушанае і натуральна вынікае з самога тэксту, – першыя старонкі твора. Назва брашуры: ані «Захад і Усход»,

[1] Далей па тэксце мы будзем прытрымлівацца наступнага падзелу: «наратара» «Адвечным шляхам» будзем згадваць толькі пад імем Абдзіраловіч, «Канчэўскі» ж будзе стасавацца выключна да канкрэтнай гістарычнай асобы аўтара.

[2] Прынамсі, аўтару гэтых радкоў нічога пра падобныя спробы тэмпаральнага прачытання твора Канчэўскага невядома.

ані «паміж Захадам і Усходам», але ж, менавіта, «Адвечным шляхам». «Адвечнасць» не як простая голая негацыя часу і гісторыі ў пазачассі і «вечнасці», але як іх пазітыўны сінтэз, падтрыманы кожным момантам і ў кожны момант; «шлях» як тэмпаральнае разгортванне прасторы, спарадкаванасць падзей у часе; нарэшце, творны склон, у які змешчана ўся канструкцыя, вымагае ўяўлення той працэсуальнасці ці падзейнасці, якая ўласна і адбываецца «адвечным шляхам».

Эпіграф, абраны Абдзіраловічам да свайго твору, пачынаецца ўласна са слова «час»:

Час, калі трэба журыцца
Душою на свежых магілах
Пуста-пранёсшыхся днёў [1, с. 7].

«Адвечным шляхам», такім чынам, запрашае нас у час патрэбы і вызначае свой час як час патрэбы. Час вымагае, патрабуе журбы, тугі па «страчаным часе», рэфлексіі аб згубе дзён і магчымасцей. Гэта час эмацыянальна споўнены, але ідэйна і падзейна пусты. Час, які супрацьпастаўляе «свежасці» гістарычных і экзістэнцыяльных ран «магілы», смерць мінулага і мінуўшчыны. Час споўнены тэмпаральнасцю[3]: калі яго цячэнне і бег выходзяць на паверхню і вярэдзяць думку і сумленне. Час, калі самотная самасць чалавека ўсамотнена бегам часу і збегам акалічнасцей, пастаўлена перад сваёй уласнай смерцю ў марнаванні часу.

Сціслая прадмова «Адвечным шляхам» таксама пачынаецца са слоў пра час: «Нашы *часы* – часы агульнай заблутанасці, *часы* паўстання праменных, быццам, ідэалаў й іх канечнага знікання праз нядаўгі *час*...» (курсіў наш. – *І. Н.*) [1, с. 7]. Першы ж сказ брашуры тройчы згадвае час. Радкамі з М. Багдановіча час патрабаваў і шукаў тых, хто адгукнецца на яго покліч і патрабаванне. Ва ўводзінах жа гэты час пазнаны і прызнаны ў якасці «нашага». «Мы», якія прыналежаць да гэтага часу, «мы», якім прыналежыць гэты час, гэта і проста сучаснікі, ахінутыя часам знікнення ідэалаў, але гэта таксама і «мы-беларусы». Часы «нашы», бо «мы-беларусы» агульна заспетыя іх зблытанасцю, неакрэсленасцю, бо гэта ў «нас», беларусаў, час найболей нялітасціва адабраў нашы надзеі, не спраўдзіў нашых спадзяванняў. І менавіта праз нашу спаняверанасць, расчараванасць «мы-беларусы» датыкаемся да найболей актуальнага сёння, найболей характэрнага для нашых часоў – да сутоння былых ідэалаў. Акурат таму, што былыя ідэалы і лозунгі пазнаны і прызнаны беларусамі як мінулае, адыходзячае ў нябыт, «мы-беларусы» найболей сучасныя «нашым часам».

[3] Тут і далей па тэксце: тэрміны «час» і «тэмпаральнасць» павінны разрозніць наступную дыхатамію: «час» – час фізічны, працягласць існавання фізічных працэсаў і адбыцця фізічных з'яў, аднастайны час; тэмпаральнасць – час фенаменалагічны, час перажыванняў і час перажыты.

Перад намі амбівалентная (і, нават, «трывалентная») канструкцыя:

1) азначэнне гістарычнага моманту і актуальнай культурнай сітуацыі («нашы часы» выступае тут як просты тэмпаральны дэйксіс[4]: «цяпер» гісторыі і культуры) як ідэйнага крызісу;

2) рэферэнцыя да апрычонай фенаменалагічнай тэмпаральнасці: перажыванне часу ў адметнай рэфлексіўнай установцы памятання, калі свядомасць адасабляе сябе ад уласных ідэй і ідэалаў, супрацьпастаўляе сябе ім як састарэлым, «зніклым», дазваляе ім растварыцца ў мінулым і адначасова ўтрымлівае іх, актуалізуе менавіта ў гэтым састарэлым, знікаючым статусе;

3) псеўдаанафарычная[5] рэферэнцыя да ідэнтычнасці «мы-беларусы»: «нашы часы…» нібы з'яўляецца рэплікай распачатага раней дыялогу, спасылаецца на ўжо прысутных суразмоўцаў, сярод якіх ужо шмат часу абмяркоўваліся адметнасці беларускай нацыянальнай гісторыі і задачы актуальнага моманту. «Нашы часы» ахоплівае ўсіх пакліканых сумоўцаў «Адвечным шляхам», паклікалі якіх акурат гэтыя разгубленасць і заблуканасць, знікненне відавочных ідэалаў.

Менавіта праз гэту амбівалентную канструкцыю, у напружанні яе семантычных полюсаў, Абдзіраловіч уводзіць «беларускі досвед» у тканіну гістарычнага і канструкцыю мадэрнасці. «Адвечным шляхам» сцвярджае адмысловае супадзенне ці перакрыжаванне хады гісторыі культуры, плыні свядомасці і гістарычнага кону беларусаў. Галоўным досведам «нашых часоў», у якія разгортваецца сказанае «Адвечным шляхам», ёсць часовасць ідэалаў – таго, што звычайна змяшчаецца вонкі гісторыі, у пазачассі і нейтральнай вечнасці. Ідэалы ў «наш» час «канечне знікаюць», знікаюць у віры дзён, няздатныя супрацьстаяць націску будзённасці. Тое, што мусіла высвяціць культурны ландшафт, даць гісторыі яе кірунак, само ператвараецца ў «бруд і пыл» [1, с. 7]. Акурат адсутнасць відавочнага выбару і творыць актуальнасць.

Дадзеная і выяўленая першым сказам прадмовы агульнасць «мы-сучаснікі» і «мы-беларусы» забіраецца ці, прынамсі, ставіцца пад пытанне сказам апошнім: «У такія часы адзінокая чалавечая душа шукае, пераглядаючы ўсё тое, што здавалася каштоўным, святым і жаданым» [1, с. 7]. «Нас» беларусаў і «нас» сучаснікаў аб'яднала, ахінула наша ўласная самота, кожны з нас пастаўлены перад патрэбамі нялітасцівага часу сам-насам, кожны мусіць даць адказ адсутнасці ідэалаў асабіста. Сённяшні час гартуе асабістае ў асобе, і менавіта таму ён супадае з адвечнасцю і адвечным шляхам.

[4] Дэйксіс (ад старажытнагрэчаскага δεῖξις – паказванне) – лінгвістычная катэгорыя, якой азначана адметная функцыя адсылкі да кантэкстуальных умоў маўлення. Дэйксіс як функцыя мовы і дэйктыкі як характэрныя адзінкі маўлення («я», «ты», «тут» і «зараз» і да т. п.) могуць быць праінтэрпрэтаваны толькі пры звароце да канкрэтных каардынат камунікатыўнага акта – часу, прасторы, удзельнікаў. Вылучаюцца тры асноўныя тыпы дэйксісу: тэмпаральны, прасторавы і персанальны.

[5] Анафарычны – які паказвае папярэднія словы, адсылае да раней сказанага.

Сказанага вышэй дастаткова, каб пераканаць – час, гісторыя і тэмпаральнасць з’яўляюцца тымі асноўнымі арыенцірамі, у рэферэнцыі да якіх разгортваецца семантыка «Адвечным шляхам». Але што гэта за час? Відавочна, гэта не календарны час з’яўлення эсэ. Сказаць, што яно было напісана 12 мая 1921 года, дадаўшы сюды колькі гістарычных дэталяў і спадарожных здарэнняў гэтага года ў беларускай гісторыі, яшчэ не значыць з’ясніць і патлумачыць тэмпаральную семантыку брашуры. Гэта і не біяграфічны час. Сказаць: Ігнат Канчэўскі напісаў «Адвечным шляхам» на дваццаць пятым, перадапошнім годзе свайго жыцця, пасля двух год змагання са смяротнай хваробай і двух год блукання па ўскрайку смерці, значыць сказаць вельмі шмат, але гэта ўсё яшчэ не значыць трапіць ва ўласны час брашуры. Мы, аддзеленыя і адлучаныя ад эсэ амаль стагоддзем, усё яшчэ пачуваемся пакліканымі яго адметным «зараз». «Нашы часы» Абдзіраловіча гэта ўсё яшчэ нашы часы. Спасылкі на час і гісторыю ў эсэ з’яўляюцца не проста адсылкамі да голага «зараз» цяперашчыны Канчэўскага, яны семантычна насычаны, сэнсава нацяты, што і дазваляе ім сягаць праз стагоддзе да істотных падстаў нашага ўласнага досведу.

Рэканструкцыя і аналіз гэтых адметных тэмпаральных рэферэнцый «Адвечным шляхам» – мэта дадзенага даследавання. Дзеля яе дасягнення намі будзе выкарыстаны метад аналітыкі выказвання – метад «Археалогіі веды» М. Фуко [2]. Пад аналітыкай выказванняў мы маем на ўвазе адмысловую практыку прачытання тэксту, для якой уласцівы наступныя рысы.

Па-першае, *псеўданаіўнасць*: сказанае і напісанае мусіць быць разгледжана ў інстанцыі ўласна сказанага, у фактычнасці выказанага. Гэта азначае часовую забарону, ці ўзяцце ў дужкі, любых інтэрпрэтацый, угрунтаваных на ментальнай ці кантэкстуальна-гістарычнай каўзальнасці. «Абдзіраловіч напісаў…, бо ён думаў, што…», «Абдзіраловіч піша… пад уплывам філосафа А / мысляра В / паэта С», «у час напісання эсэ здарылася {пэўная гістарычная ці культурная падзея}, што змусіла Абдзіраловіча казаць, што…». Любыя інтэрпрэтацыі гэтага шэрага адразу прамінаюць уласцівую тэксту твора тэмпаральнасць, натуралізуюць яе. Не папярэднія сказанаму думкі і разважанні Канчэўскага, не бясконцая плынь традыцыі ці даўгі ланцуг спадкаемнасці філасофскіх ідэй нас будуць цікавіць, а тая адметная часовасць, што ўтвараецца выказваннямі эсэ і аднамомантная кожнаму з іх.

Па-другое, утрыманне суб’екта выказванняў у якасці зменлівай функцыі, якая пульсуе ў тэксце, то расхінаючыся ў агульназначных выказваннях да ўсеабдымных рамак, калі на месца суб’екта можа быць падстаўлены літаральна любы, то набываючы кантэкстуальныя ўмовы, калі суб’ект выказвання набывае свае канкрэтныя рысы, а гранічна супадае з адзінкавай, канкрэтнай асобай – Ігнатам Канчэўскім. Суб’ект выказвання – гэта функцыя, якой «той, хто кажа», пастаўлены ў пэўную пазіцыю да былых (сваіх і чужых), меўшых месца раней выказванняў, – яму *вядомы* пэўны аб’ём сказанага раней, ён актуалізуе пэўны аб’ём папярэдне выказанага. Прытым такое «вядомае» і актуалі-

заванае выказваннем нельга наўпрост атаясамліваць з псіхічнымі актамі ў свядомасці прамоўцы. Калі Абдзіраловіч кажа «дзесяцёхвяковае ваганне сведчыць аб тым…», гэта не значыць, што ў момант напісання дадзенага радка ў яго свядомасці прамільгнулі дзесяць стагоддзяў беларускай гісторыі, гэта значыць толькі, што вобраз дзесяці стагоддзяў аперацыяналізаваны ў якасці доказу пэўнага сцверджання.

Агульную траекторыю разважання ў эсэ можна ахарактарызаваць так: ад ітэратыўнай гісторыі[6] – праз міфалагічнае і/ці персаналісцкае «зараз» – да будучыні як экзістэнцыяльнага выкліку. На паўторы гэтай лініі пабудаваны ўсе чатыры часткі твора.

Змястоўную частку кнігі пачынае беларуская гісторыя, дакладней – гістарыясофскія развагі з нагоды мінулага Беларусі і над мінуўшчынай Беларусі. Але беларуская гісторыя ўводзіцца ў тканіну тэксту «Адвечным шляхам» незвычайна: яна даецца праз вонкавыя погляд і меркаванне. «На беларускую справу прызвычаіліся глядзець як на нешта надта невыразнае…» [1, с. 8]. Гэты погляд звонку, ягоны голас, тыя аргументы, на якія ён абапіраецца, будзе пераследаваць увесь выклад гісторыі Беларусі. Да гэтага вонкавага погляду звяртаецца тэкст, гэтыя вонкавыя меркаванні Абдзіраловіч аспрэчвае і перагортвае ў іншую, унутраную інтэрпрэтацыю беларускага мінулага.

Бясспрэчна, калі размова не вядзецца пра мастацкі свет, гістарычны час і наратар амаль заўжды адасоблены. Дзеля аналізу гісторыі патрабуецца вонкавы пункт гледжання, палярнасць паміж «тады» і «зараз». Але той погляд, які так уладна ўрываецца ў першыя ж радкі змястоўнай часткі «Адвечным шляхам» і спяшаецца выказаць сваё стаўленне да беларускай гісторыі і беларускай справы, не проста вонкавы, ён «чужы» і адчужаючы. Адразу гэты чужы, знешні погляд бярэ голас і спрабуе аспрэчыць само права беларусаў на існаванне. Гэта не погляд і не голас аўтара, алё ж і ігнараваць гэты голас, не заўважаць яго ён не можа, не ў стане. Абдзіраловіч прызнае гэты голас, нібы падхоплівае распачаты ім дыялог, прызнае частковую праўду і небеспадстаўнасць сказанага ім.

«На беларускую справу прызвычаіліся глядзець…», «у невыразнасці беларускай культуры хочуць бачыць...». Хто тут тыя, што «глядзяць» ці «бачаць»? Носьбіты гэтага погляду не названы. Наўрад ці гэта проста чужынцы, прыхадні, абсалютна вонкавыя сузіральнікі. Бо, у адрозненне ад такіх чыстых чужынцаў, носьбіты гэтага погляду абазнаныя ў беларускасці – для галасоў адмаўлення беларускай справы ўласціва веда: веданне гісторыі Беларусі і яе сённяшняга фактычнага стану. Гэта голас і погляд непаклікaных «беларускаю справай», голас сумнення ў ёй: магчыма – голас меркантыльнага адміністра-

[6] Тут і далей мы абапіраемся на размежаванне «сінгулятыў»/«ітэратыў», прапанаванае Ж. Жэнетам у адносінах да наратыву (гл.: [3]), дзе сінгулятыў адносіцца да выказвання, якое апісвае адзінкавую падзею, а ітэратыў – да выказвання, якое апісвае паўтаральныя падзеі і характэрнае для іх класа ці сукупнасці.

тара і мешчаніна, голас адмаўлення культурніцкіх разваг і метафізічных летуценняў, магчыма – патаемны голас сумневу кожнага з беларусаў, у пераадоленні якога і гартуецца ўласна беларускасць, нацыянальная свядомасць.

«Справа беларусаў» утворана не сёння, з гісторыі (і праз гісторыю) яна пранесла сваю адмысловую адзнаку – «невыразнасць». Гісторыя беларусаў навідавоку[7], усе яе дзесяць вякоў як на далоні ляжаць безабаронныя пад чужым поглядам, і акурат гэтаму чужому меркаванню, асуджэнню выпала весці рэй у інтэрпрэтацыі беларускага мінулага. Фармальнае, знешняе асэнсаванне гісторыі беларусаў цалкам аддадзена вонкаваму погляду.

Тэкст «Адвечным шляхам» не толькі прызнае азначэнне беларускай культуры як невыразнай, пазбаўленай уласнай формы, але паглыбляе яго і праз гэтае паглыбленне перагортвае яго. Беларусы не проста не здолелі знайсці ўласнага ідэалу і форм упарадкавання свайго жыцця. Гэта быў свядомы, валявы выбар, пацверджаны кожным з дзесяці стагоддзяў, і ў кожным з дзесяці стагоддзяў, выбар пранесены праз усё тысячагоддзе. Акурат таму, што і зараз, у сваёй цяперменчыне, беларусы пастаўлены перад аднолькава непрымальнымі і аднолькава зразумелымі альтэрнатывамі, акурат таму, што для іх аднолькава разумныя і аднолькава абмежаваныя абедзве «праўды», менавіта таму для іх дасяжны іншы, унутраны погляд на сваю гісторыю і з'яўляецца магчымасць зразумець рацыю продкаў. Менавіта гэты ўнутраны штыль ёсць найвышэйшай кропкай «беларускай душы», з якой магчыма агледзець і зразумець увесь прасцяг сваёй гісторыі. Нарэшце, менавіта беларускае ваганне, одум, спаняверанасць у гатовых рэцэптах і простых рашэннях зараз, «калі набліжаецца вялікі крызіс датыхчасовых ідэалаў, калі ўся "культура" знаходзіцца ў небяспецы і гатова разваліцца ў руіны» [1, с. 9], аказваюцца найбольш сугучны, найбольш надзённы еўрапейскай мадэрнасці. Сённяшні беларускі досвед сугучны і з запаветным сваёй мінуўшчыны, і з найболей актуальным для сучаснасці.

Гісторыя Беларусі пачынаецца з чужых слоў – яе ўжо пазналі, узважылі і ацанілі. Яна належыць не мінуўшчыне, але сучаснасці – гэта яе зараз закідаюць беларусам як доказ іх негістарычнасці. Гісторыя Беларусі падхоплена з чужога, ананімнага голасу, чыю грэблівую інтанацыю ўжо нельга «вытравіць» з яе. Але гэта, кажа Абдзіраловіч, і не патрэбна: той, хто грэбуе, знікне сам пад напорам сучаснасці, разам з адназначнасцю сваіх крытэрыяў і мерак, тое чым грэбавалі – застанецца, бо яно наймацнейшае і трывалейшае, бо беларусы здавён пазналі часовасць саміх мер, мінальнасць саміх крытэрыяў.

Сама гісторыя Беларусі, яе «змест» даецца таксама нязвыклым чынам. Яна амаль пазбаўленая ўласна «гістарычнага»: падзей і ўчынкаў, бітваў ці дзяржаўных актаў. Гэта гісторыя, у якой няма месца здзяйсненням і закончанаму трыванню, яна падаецца як доўжанне, паўтор і ітэрацыя – «дзесяцёхвяковае

[7] Параўнайце з цалкам іншай стратэгіяй канцэптуалізацыі беларускай гісторыі, на якой пабудаваны «Лабірынты» В. Ластоўскага.

ваганне», «крывавая барацьба» [1, с. 8, 10] і г. д. Гэта ітэратыўнасць агляднага мінулага Беларусі дазваляе асіміляваць яго ў адзінства экзістэнцыяльнага «мы»: «мы не зрабіліся», «мы былі благімі сынамі і царквы і касцёлу і “ojczyzny” і “отечества”», «мы мала маем», «мы шукалі па чужых дарогах» [1, с. 8].

Сярод манатоннасці беларускай гісторыі як доўжання таго ж самага вылучаюцца: па-першае, момант яе пачатку – Хрышчэнне і, па-другое, персаналіі, лёс і жыццё якіх найболей адбілі адметнасць беларускага «шляху»: Рагнеда, Усяслаў Чарадзей, А. Міцкевіч. Але сапраўдным дантавым Вяргіліям, які праводзіць Абдзіраловіча праз колы беларускай гісторыі і дазваляе абудзіцца ад яе кашмару, у эсэ выступае Францыск Скарына. Ён вітае нас ля парогу гісторыі, яму ж належыць права падагульніць яе сваімі словамі. Скарына не прыналежыць гісторыі ці мінуўшчыне – ён частка сучаснасці. Скарына «пазірае на нас» [1, с. 9], размаўляе з сучаснасцю, для сучаснасці і зыходзячы з сучаснасці («І на ўсходзе і на захадзе – шукайце!» [1, с. 9]), яго прысутнасць у свядомасці сённяшніх беларусаў не належыць часу гісторыі, але – прасторы дыялогу. Скарына анахранічны ў тым сэнсе, што ён не прыналежыць выключна сваім «родным» XVI–XVII стагоддзям, не раствараецца цалкам у іх кантэксце – ён належыць да беларускай гісторыі як цэлага. Ёсць у гісторыі Беларусі і яшчэ адна кропка, дзе прыпыняецца яе кружляючы бег: не аблуднае выйсце ў чужынскую будучыню, якой спакусіліся толькі «духоўна-распусныя» [1, с. 8] адзінкі, але сапраўднае выйсце з лабірынтаў часу ў імгненне здабыцця аўтэнтычнасці. Абдзіраловічава гісторыя эсхаталагічная, але гэта своеасаблівая эсхаталогія – эсхаталогія вольнасці, аўтэнтычнасці. Да аўтэнтыкі пакліканы беларускі народ сённяшнім днём і самім «жыццём» [1, с. 11], у гэтай шуканай аўтэнтыцы ён скіне з сябе цяжар сваёй гісторыі, пакінуўшы пры сабе толькі постаць Скарыны і гарт недаверу да чужых ідэалаў.

Пацверджаная гісторыяй і заваяваная на працягу гісторыі недалучанасць ані да Усходу, ані да Захаду, пры зразумеласці таго ды іншага, надае беларусам права і прывілей на адметнае веданне абодвух. Веданне Захаду і Усходу для беларусаў непасрэднае, дадзенае і перажытае. Беларусы не спасцігалі Захад і Усход, Захад і Усход спасцiглі Беларусь. Яны ўтвараюць «сваё чужое» беларускай гісторыі, з якой адчыняецца спазор на іх стоеную істу. Захад і Усход прысутныя ў свядомасці беларусаў не як культурныя тыпы, але як квазі-персаналіі, квазі-асобы. Абдзіраловіч кажа: «усходні славянін не любіць нічога палавіннага» [1, с. 12], «усходні чалавек лічыць» [1, с. 13]; Захад «ішоў да нас з прыемнай усмешкай на рожавых вуснах» [1, с. 16]. Вельмі характэрная абмоўка: «Затое Захад – вялікі чалавек на малыя справы» [1, с. 16]. Выказванне няправільнае паводле лінгвістычных канвенцый, але дакладнае паводле той фенаменалогіі Захаду і Усходу, што разгорнута ў эсэ. Падобна да ўчынкаў асобы, гісторыя Захаду і Усходу не рассыпаецца на асобныя здарэнні і падзеі, але інтэгруецца ў адзіныя вобразы: Захад і Усход гэта «знаёмыя» беларусаў, чые

словы, рацыі і дзеі знаёмыя, зразуметыя і адрынутыя як не сваё, але ж і не цалкам чужое.

Агляд беларускай гісторыі канчаецца падвойным «трэба шукаць на другіх шляхох» [1, с. 17, 18]. Гэтым «трэба» акрэслена ўласна будучыня – яна не надыходзіць, не наступае, але ж творыцца і шукаецца. «Трэба шукаць» – гэта і покліч самой будучыні, гэта яна сама шукае сваіх сучаснікаў. Будучыня не фізічная – яна дэанталагічная.

Другую частку эсэ таксама распачынае гісторыя/гістарыясофія, але гэтым разам ужо агульнаеўрапейская. «Сучасныя еўрапейскія народы адтрымалі сваю культуру як спадчыну антычнай імперыі» [1, с. 18]. Сучаснасць Еўропы не ёсць яе ўласная сучаснасць – яна не прыналежыць ёй, у яе інкруставана мінулае Еўропы іншай – антычнай.

Антычнасць загінула дзеля рассінхранізацыі патрэб і жаданняў асобы, адзінкі, з аднаго боку, і дзяржавы, палітычнага, сацыяльнага ладу – з другога. Антычнасць не здолела вырашыць пытання аб «адносінах вечнага і смертнага, канечнага і бесканечнага» [1, с. 18], пакінуўшы гэтыя пытанні ў спадчыну сучаснасці. Суаднесенасць матэрыяльнага і ідэальнага, сінгулярнага і ўніверсальнага, індывідуальнага і сацыяльнага – усе гэтыя дыхатаміі Абдзіраловіч нанізвае на тэмпаральную лінію (вечнае/смяротнае).

Варвары пазычылі ў Антычнасці яе знешнасць, навочнасць – тое, што бачна і падуладна вызначэнню. Але падобнае выяўленае навонкі, адкрытае называнню і азначэнню «заўсёднае» [1, с. 19] – пазбаўленае руху, мёртвае, форма прасторавая ў супрацьлегласць жыццю і духу, якія належаць часу, плыні, развіццю. Дакладней, у «цвёрдай» [1, с. 19] формы таксама ёсць свой час – але гэта час здранцвення і смерці.

Выклад еўрапейскай гісторыі ізноў разгортваецца ў той жа ітэратыўнай мадальнасці, з персаналізаванымі ўвасабленнямі культуры ў якасці яе а́ктараў: «еўрапеец стараецца здзейсніць сваю прыхільнасць да цвёрдых форм», «Усход рыпаецца ўзяць візантыйскую спадчыну», «Захад карыстае багаццем рымскай культуры» [1, с. 19] і г. д. Амаль увесь абзац, прысвечаны еўрапейскай гісторыі, рэалізаваны праз незакончанае трыванне і цяперашні час, нібы мы ўсё яшчэ з’яўляемся непасрэднымі сведкамі «старання» еўрапейца, «рыпання» Усходу і г. д. Гэта гісторыя, якая не мае сваёй здзейсненасці, усё яшчэ прысутная. Мінулы час стасуецца выключна да адмоўнасці, паразы, адсутнасці выніку: «адраджэнскі пратэст не здзейсніўся», «старое аджыло, спарахнела», «зноў усё, як быццам, замірае да новага спалоху», «Усход спазніўся» [1, с. 20].

Развагі аб прычынах духоўнай трагедыі Еўропы Абдзіраловіч будуе вакол яшчэ адной экзістэнцыяльна-тэмпаральнай катэгорыі – жыцця. Жыццё тут – 1) фенаменалагічны спод фізічнага часу, 2) індывідуальная гісторыя, 3) спарадкаванасць падзей у часе, інтэграваная вакол прынцыпаў вітальнасці і творчасці, 4) тое, што супрацьстаіць тагасветнаму, як пазбаўленаму зямной часовасці, тое, што супрацьстаіць смерці, як спыненню быцця ў часе.

«Немаль уся жыццёвая нядоля мае сваёй падставай неадпаведнасць жыццёвага зместу тым формам, у якія ён уложаны» [1, с. 20]. Пражыты час успрымаецца як нялёсны, не свой і не аўтэнтычны, калі ён запаволены, затрыманы вонкавымі акалічнасцямі. Такімі вонкавымі акалічнасцямі і з'яўляюцца «формы жыцця»: паўтаральныя структуры сацыяльнага і палітычнага ўзаемадзеяння («сям'я, гаспадарства, суд, касцёл, партыя» [1, с. 20]). Усе існыя формы жыцця створаны самім чалавекам «у часе патрэбы» [1, с. 20]. Але створаная дзеля канкрэтных мэт і ў канкрэтны час жыцця форма адрываецца, адасабляецца ад гэтай сваёй жыццёвай і часавай лакалізацыі, выяўляе свае ўніверсальныя і пазачасавыя апетыты.

Амаль увесь урывак «Адвечнага шляху», прысвечаны дыхатаміі жыццё/форма, разгортваецца ў своеасаблівым тэмпаральным модусе «заўсёднасці». Да кожнай выказанай тэзы можна падставіць «заўсёды». Болей таго, аўтар сам шчодра расстаўляе гэтае «заўсёды» ў тэксце:

«патрэбна ліючаяся, зменная, *заўсёды* адпаведная жыццёвым праявам форма» [1, с. 21],

«чалавек творыць *заўсёды* кахаючы» [1, с. 21],

«маральны закон, абычаёвае права [...] *заўсёды* мае адзнаку боскасці» [1, с. 21],

«калі чалавеку або грамадзе істнуючая форма здаецца карыснай, тады *заўсёды* эгаістычныя мэты аздабляюцца істнуючай формай» [1, с. 21].

«Заўсёды» тут – замена квантарам ўсеагульнасці. Гэта нейтральная адносна канкрэтнага часу, нелакальная, тэмпаральная квантыфікацыя, якая паклікана адпрэчыць канкрэтна-часавую прывязку, надаць тэзам універсальнасць. Такая «заўсёднасць» выступае найбольш пашыранай жанравай тэмпаральнасцю філасофскіх сцверджанняў. Часцей за ўсе акурат у такой заўсёднасці разгортваюцца філасофскі тэкст і філасофская развага.

Мы лічым гэта вельмі сімптаматычным: 1) «Адвечным шляхам» пераважна абмінае гэтую звычаёвую філасофскую часовасць, аддаючы перавагу зусім іншым тэмпральным мадальнасцям; 2) там, дзе такая ўніверсальна-нейтральная часовасць непазбежная, тэкст расквечваецца гэтымі шматлікімі «заўсёды». Заўважым, Абдзіраловіч зусім не выкарыстоўвае болей канвенцыйныя квантары ўсеагульнасці, кшталту:

{кожны/усякі} «чалавек творыць кахаючы»,

{усе} «маральныя законы маюць адзнаку боскасці»

і да т. п.

Гэта не простая выпадковасць ці індывідуальнае лексічнае ўпадабанне Абдзіраловіч акрэслівае і падкрэслівае гэтую заўсёднасць, бо яна яму не да спадобы, бо акурат яна – аб'ект крытыкі эсэ. Не заўсёднае шукае аўтар эсэ, але адвечнае: не нейтральнае, надчасовае, але прысутнае штомомант, унутры кожнага імгнення.

Формы жывуць запазычаным жыццём, сілкуюцца чалавечай любоўю ці сквапнасцю і запавольваюць жыццё сапраўднае – чалавечае і духоўнае. Формы

няўчасныя і несвоечасовыя: «свой» час касцёльнага ладу, дзяржаўнага і сацыяльнага спарадкавання, звычаяў, лозунгаў і дактрын, час, калі яны адпавядалі патрэбам і мелі наўпросты сэнс, – гэты час мінуў. Але яны захаваліся да нашага часу ў выглядзе незразумелых, неразумных божышч, малохаў, у імя няўцямнасці якіх ахвяруецца маладое жыццё. «Сколькі малохаў захавалася да нашага часу?» [1, с. 22] – гэтае пытанне не столькі Абдзіраловіча, колькі самога нашага часу, гэта начаснае пытанне Мадэрнасці. Бо ж гэтая Мадэрнасць успрымае як кантрабанду спробу пранесці ў сёння сацыяльныя і ідэалагічныя формы, толькі дзеля іх асвечанасці традыцыяй. Наш, мадэрны, час ставіць заслону плыні гісторыі і, падобна ўвішнаму мытніку, патрабуе дакладных рацый у неабходнасці пераносу ідэй, сацыяльных форм з мінулага ў сучаснасць. Уласны час Мадэрну, яго сапраўдная цяпершчына – гэта ўхронія[8], дзе кожнае ўстанаўленне мае свой дакладны сэнс і разумнасць. Абдзіраловіч нібы пазычае гэтае запытанне Мадэрну: патрабуе асветы «цёмных малаасвечанах народаў» [1, с. 22]; шукае той кантаўскай сталасці духу, якая жыве ўласным розумам, без штучных мыліц чужых падказак; патрабуе жыць без «прыхільнасці да рознага роду аўтарытэтаў, пашаны да пісаных законаў», дзеля якіх чалавек «не робіць клопату ў кожным выпадку думаць, як трэба рабіць, і звяртацца да ўласнага сумлення» [1, с. 22]. Але «Адвечным шляхам» кіруецца не сцяжынай класічных мадэрнізацыйных праектаў, і тэмпаральная ўстаноўка эсэ – гэта не асветніцкая ўстаноўка ў чыстым выглядзе. Гэта, хутчэй, зварот крытыкі Мадэрнасці на саму сябе, асучасніванне сучаснасці, асветніцкая крытыка прымхаў і ідалаў – але прымхаў і ідалаў самога Асветніцтва. Бо пошукі адзіных, універсальных, «заўсёдных», рацыянальных падстаў жыцця прамінулі ўласна само жыццё, рассінхранізаваліся з унутраным рытмам і «хронаметражам» чалавечага быцця. Быццё зменлівае, пратэічнае, падобнае да «вулканічнага грунту» [1, с. 22], увагнаць яго ў адзіныя «заўсёдныя» формы можна толькі за кошт яго інтэнсіўнасці і патэнцыяльнасці. Хто пражывае жыццё ў аднастайных, раз і назаўжды дадзеных формах, пражывае не сваё жыццё і не свой, аўтэнтычны час. Такім чынам нараджаецца ідэалогія сучаснасці – «духоўнае мяшчанства» [1, с. 22]. Мешчанін жыве пустой сучаснасцю, яна не мае каранёў у яго ўнутраным быцці, не споўненая ўнутранымі сэнсамі і асэнсаваннем. Гэтая сучаснасць мае вонкавыя, прымусовыя механізмы распаўсюджання – моду, дысцыпліну і бюракратыю [1, с. 24].

Адной з галоўных тэзаў твора ёсць тая, што ідэі таксама маюць гісторыю і свае жыццёвыя цыклы. Ідэі нараджаюцца, развіваюцца і паміраюць – такую «жыццёвую» метафізіку Абдзіраловіч супрацьпастаўляе метафізіцы платанічнай, дзе ідэі цалкам належалі несмяротнаму свету. Акурат смерцю ідэі ёсць яе пераўвасабленне ў застылую форму, менавіта гэтай смяротнасці ідэй не бачыць мешчанін, не бачыць, як «у труне формул калісь святыя ідэі змарнелі, сплеснелі,

[8] Часавы адпаведнік прасторавай утопіі.

што час прайшоў і вымагае новай творчасці» [1, с. 24]. Звернем увагу на гэты анакалуф[9], які Абдзіраловіч уводзіць у тэкст: час прайшоў, але ён жа вымагае творчасці, – час мінае, знікае ў нябыце, але ён жа і застаецца тут, пры нас, патрабуючы змяняцца, развівацца. Ізноў: памылка з пункта гледжання моўных норм і ўсё ж цалкам слушная канструкцыя, зыходзячы з сінтаксісу мыслення, захопленага парадоксамі часу.

«Духоўнае мяшчанства было заўсёды», – кажа Абдзіраловіч, было як патэнцыя, як адзін з модусаў тэмпаральнасці, як здавальненне і заспакаенне ў цяпер. Але сапраўднай азнакай часу духоўнае мяшчанства стала зараз: «У нашы часы такі духоўны светагляд зрабіўся блізка што агульным» [1, с. 24].

Зараз духоўнае мяшчанства вызначае сутнасць гісторыі і сучаснасці, падкрэслівае аўтар, каб у наступным абзацы выгукнуць: «…час пераканацца, што няма формаў універсальных…» [1, с. 24]. «Нашы часы» гэта час агульнага панавання ўніверсальных норм, але гэта і час, калі наспела патрэба і магчымасць такую ўніверсальнасць аспрэчыць і зрынуць. Як прачытаць гэты ўрывак, пазбягаючы парадоксу? «Нашы часы» як *цяпер*, сукупнасць наяўнага, азначаны і вызначаны панаваннем «духоўнага мяшчанства»; «нашы часы» як *актуальнае*, як кропка да пераходу ў прышласць, небылое, але шуканае – гэта час зрынання застылых форм.

«Упалі ўсе формы, якія хацелі панаваць над чалавекам», «ляжаць разбітыя і растрэсканыя каля ног чалавека Малох рэлігіі, гаспадарства, пісанай маралі і яшчэ, і яшчэ» [1, с. 24], – Абдзіраловіч кажа нават у мінулым часе, нібы аб тым, што ўжо мела месца. Гэта адметны мінулы час – мінулы час прароцтва і адкрыцця, як у Апакаліпсісе «упаў, упаў, Вавілоне, вялікая блудадзейка» (Адкр. 18 : 2) [4]. Гэта адметная, амаль рэлігійная, танальнасць урыўка нават падкрэслена стылістычна і сінтаксічна. Яшчэ адна форма «працы» з часам: будучае, шуканае і памыснае можа быць убачаным як былое, здзейсненае. Гэта будучае, перажытае як ужо былое, адсвечвае свабодай у сучаснасць, паняволеную застылымі формамі, зрынае «мёртвую ўладу струхлеўшых форм» [1, с. 25]. Адзначым гэтую «мёртвую ўладу» (не ўлада мёртвага, да прыкладу, але мёртвая ўлада) – чарговае парушэнне моўных норм, матываванае сінтаксісам мыслення тэмпаральнасці.

Першую частку пачынала беларуская гісторыя, другую – агульнаеўрапейская, трэцюю ж адчыняе гісторыя антрапалагічная. «Да нашай пары мэтай выхавання было навучыць жыццю: гэта значыць даць чалавеку гатовыя шаблоны…» [1, с. 25], – Абдзіраловіч прыбірае ўсе пазнакі, маркёры канкрэтнай прасторавай і лакальна-культурнай суаднесенасці, запрашае прачытаць свае развагі ў якасці рэферэнтных да гісторыі чалавецтва як такога. Адначасова

[9] Анакалуф (ад старажытнагрэцкага ἀνακόλουθον) – стылістычная памылка ці свядомы рытарычны/паэтычны прыём, звязаны з парушэннем сінтаксічных норм, калі адно слова выкарыстоўваецца ў розных значэннях, да прыкладу: «праходзілі дні і мінакі».

з гэтым узбуйненнем маштабу паскараецца рытм аповеду, расце яго інтэнсіўнасць. Сваю звычайную сцяжыну: ітэратыўнае мінулае – персаналісцкае зараз – дэанталагічная будучыня, – Абдзіраловіч «прабягае» літаральна за дзве старонкі. Мінулае чалавецтва пададзена вельмі эскізна, начарна. «Адвечным шляхам» прапануе нам прачытаць антрапалагічную гісторыю як гісторыю выхавання: «…выхаванне імкнула…» [1, с. 25–26]. Але канкрэтныя абрысы гэтай гісторыі выхавання/гісторыі чалавецтва не названы і не выказаны.

Яшчэ адно значэнне сучаснасці, імпліцытна прысутнае ў мінулых гістарычных экскурсах: сучаснасць як палетак, дзе родзіць насенне мінулага ці дзе яно застаецца без плёну; сучаснасць як суд над мінулым, дзе суддзя і пацярпелы супадаюць – «да нашай пары мэтай выхавання было [...] і вось што выпрацавалі такія зданні» [1, с. 25–26]. Будучыня ўраблялася шляхам выхавання пашаны да наяўнага і прызнанага, таму час толькі доўжыў саматоеснае, нерухомае і пазбаўленае творчасці бытаванне. «Наша пара» – час нядолі і рабства, можа цягнуцца яшчэ бясконца, але ён ужо зараз можа стацца і часам азірнуцца назад і прызнаць аблуднасць пройдзеных сцежак.

Пошук аўтэнтычнай будучыні выяўляе лакальнасць іншага, сапраўднага часу – часу змен і зменлівасці, часу не наяўнага, але часу творчасці. Такі час зараз дзейнічае толькі «ў вольных далінах мастацтва і навукі» [1, с. 26].

Творчасць і мастацтва – узор таго, якім мае быць жыццё, – выяўляюцца як прысутныя ў адметным «зараз» дыялогу. Тэкст твора разгортваецца для чытача ў серыі пытанняў, адказаў, прызнанняў, запрашае яго ўбачыць мастака за працай: «сапраўды, што такое – мастацтва?» [1, с. 26], «праўда, такой гармоніі паміж зместам і формай у жыцці няма», «што далей бачым у мастацтве?», «ці яно калі-небудзь задаволена [...]? – Не!» [1, с. 27]. Мастацтва і мастак прысутнічаюць як непасрэдны, навочны рэферэнцыяльны гарызонт дыялогу аўтара са сваім чытачом – яны тут і зараз. Гэта і ёсць тое, што мы пазначалі як «персаналісцкае зараз» «Адвечнага шляху». «Мы» – мастак, Абдзіраловіч, чытач, – сучасныя, аднамомантныя ў сваім усведамленні, засведчанні творчасці. Кожны з нас «прыйшоў у свет падзівіцца з яго хараства» [1, с. 28]. І менавіта зараз, калі мы, кожны паасобку, і ўсё ж супольна, дзівімся творчасцю і яе хараством, мы сапраўды знаходзімся ва ўласным «зараз», а не ў пустэчы пазычанага «цяпер» як вонкавай, фізічнай сумеснасці і ўнутранай, духоўнай самоты. З гэтага супольнага разумення і сумеснага засведчання прарастае сапраўдная сучаснасць, у якой магчыма сапраўднае паразуменне і асэнсаваная размова, нават калі яе рэплікі размежаваныя амаль стагоддзем.

Да гэтага знойдзенага, здабытага «мы» Абдзіраловіч звяртаецца з серыяй заклікаў: «вось і мы ў нашым штодзённым жыцці павінны быць такімі тварцамі», «хай не будзе [...] нічога нярухомага, святога», «хай не будзе строгіх дырэктыў», «хай не будзе “чалавекаў у футлярах” [1, с. 27], «хай гучыць у сэрцы кожнага» [1, с. 28], – акрэсліваючы тым самым будучыню гэтага «мы» як экзістэнцыйны выклік.

У гэты момант тэкст «Адвечным шляхам» фактычна разрываецца, ці, нават, адрываецца ў іншую танальнасць, у іншую тэмпаральную мадальнасць – у *спрадвечнае* «*зараз*» міфа. Маецца на ўвазе фантастычны, такі неразважлівы, але ж і такі сімпатычны, сімптаматычны для юнацкай беларускай філасофіі адцінак, прысвечаны «Матцы-Матэрыі» і «Бацьку-Купале». Засяродзіўшыся на ўласна тэмпаральнасці, зазначым: казаным ёсць нібы прадчассе – пачатак Сусвету і самой магчымасці часу, але выказваецца яно ў граматычных формах цяперашняга часу і з перцэпцыйнага пункта гледжання наяўнага, якое адбываецца «на вачох», ці, хутчэй, непасрэдна чутнага, бо асноўныя прэдыкаты тут – аўдыяльныя: «Поўна Яна [Матка-Матэрыя] смутку, поўна галасоў неясных, быццам шапаценне нераспушчанага лісця…», «вось адхінаецца прадвечны туман», «загрымяць грамніцы, патрасаючы выразным грукатам прадвечную безгалоснасць, – гэта прачхнуўся, вышаўшы з лана Маці, адвечны Купала, гэта яго павіншаванне сваёй матцы, гэта першая ласка сваёй жонцы» [1, с. 28]. Тое, што было напачатку ўсяго, можа і мусіць быць пачутым зараз, паўтораным зараз, каб давесці як сваю праўдзівасць, так і ісціну гэтага «зараз». Няма вечнага як простай сумы імгненняў ці як тагасветнага ў адносінах да смяротнага і зменлівага; ёсць толькі адвечнае і спаконвечнае, якое залучана кожным момантам, іманентна яму, якое чуваць у кожнае імгненне і якім кожнае імгненне паклікана.

У апошняй, чацвёртай, частцы яшчэ раз сцісла паўтараецца тое ж тэмпаральнае і гістарычнае рушанне, якое мы прааналізавалі вышэй.

1. *Ітэратыўная гісторыя* рассінхранізаванасці асобы і грамады («трудна было шукаючай адзінцы здаволіцца такімі абставінамі. Яна рвалася на волю, але там чакалі яе дзікія звяры, голад, небяспечнасць» [1, с. 39]) і праблёскаў аўтэнтычнай свабоды і творчасці («Беларускія сябрыны, паўночна-славянскія ватагі, чарнагорскія ўдружэнні, чэскія задругі то на лёгкіх чаўнох па рэках і морах, то сухім шляхам ідуць на новыя месцы, займаюцца промысламі, творачы сабе жыццё, якое ім здаецца лепшым» [1, с. 40]).

2. *Персаналісцкае «зараз»*: «упэцканая ў селядцовым сосе» [1, с. 40–41] кааперацыя ўсе ж адстойвае сваю годнасць і праўду ў дыялогу з сучаснасцю: «Кааперацыя ня кажа: “Я маю гатовую праўду: прыходзь і бяры”, яна толькі кажа: “Твары, творачы – руйнуем”», «сапраўдная кааперацыя адказвае яму: “Дурны хлопец, ці можна жыццю прадмаўляць гатовыя шляхі”» [1, с. 41].

3. *Дэанталагічная будучыня* і *будучыня як экзістэнцыяльны выклік*: «Кожны павінен быць вольны ў сваіх жаданнях. Ніякіх прымусовых ахвяр, ніякіх багоў не павінна быць» [1, с. 42]; будучыня не як надыходзячае, але як шуканае і прысутнае ўжо зараз і спрадвеку: «у гэтым – наша надзея, у гэтым нагад на прадсвет і запраўдны жыццёвы кірунак» [1, с. 42]; будучыня як прадвешчанае мінулае і цяперашняе: «і цяпер прабуджаныя да творчасці народныя масы, чуючы ў сабе прысутнасць Міравой душы, з пэўнасцю кажуць: “творачы – зруйнуем”» [1, с. 43].

У дадзеным артыкуле мы першымі сярод інтэрпрэтатараў і крытыкаў вядомага эсэ І. Абдзіраловіча (Канчэўскага) «Адвечным шляхам» звяртаемся да праблематыкі тэмпаральнасці і часу ў гэтым тэксце: як аўтар і мысляр разумее свае часы і час як такі, якім чынам ён апісвае «зараз» Беларусі і еўрапейскай культуры, іх гісторыю і магчымую будучыню, якім чынам ён выкарыстоўвае шматаспектнасць чалавечага досведу часу і полісемантызм часавых катэгорый для разгортвання і давядзення сваіх думак. Пры гэтым мы паказваем: акурат рэферэнцыя да часу, часовасці чалавечага быцця і адметнай тэмпаральнасці, уласцівай чалавечай свядомасці, як і адметная інтэрпрэтацыя гісторыі і гістарычнысці чалавечага досведу, выступаюць і як асноўны стылістычны і рытарычны прыём пісьма ў творы, так і адной з асноўных «прылад» мыслення Абдзіраловіча. Слушнасць і эўрыстыку такога падыходу даводзяць літаральна першыя ж старонкі эсэ: час, дакладней яго канкрэтная мадальнасць – адвечнасць, з'яўляецца ўжо ў назве, са слова «час» пачынаецца эпіграф да ўсяго тэксту, «час» тройчы згадваецца ў першым жа сказе «Адвечным шляхам». Менавіта акцэнт на тэмпаральнай семантыцы дазволіў нам упершыню заўважыць і апісаць адметную структуру, на паўторы якой пабудаваны ўсе чатыры часткі «Адвечным шляхам»: ад ітэратыўнай гісторыі ці гісторыі як ітэрацыі – праз сучаснасць як персаналісцкае і/ці міфалагічнае «зараз» – да дэанталагічнай будучыні, ці будучыні як экзістэнцыяльнага выкліку.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Ігнат Абдзіраловіч [Канчэўскі, І. У.]. Адвечным шляхам: даследзіны беларускага светагляду / Ігнат Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 42, [2] с. – (Згукі мінуўшчыны).

2. Фуко, М. Археология знания : пер. с фр. / Мишель Фуко. – СПб. : Гуманитар. акад., 2004. – 412, [3] с. – (Ars Pura. Французская коллекция).

3. Женетт, Ж. Фигуры : работы по поэтике : [в 2 т.] / Жерар Женетт. – М. : Изд-во им. Сабашниковых, 1998. – Т. 1–2. – С. 140–153.

4. Біблія: Кнігі Сьвятога Пісаньня Старога і Новага Запавету кананічныя ў беларускім перакладзе / пер. В. Сёмухі. – Duncanville, USA: World Wide Printing, 2002. – 1536 с.